а. Леў Гарошка.

ПАХОДЖАНЬНЕ ЧАЛАВЕКА

У СЬВЯТЛЕ СУЧАСНЫХ ЗНАХАДКАЎ.

ПАРЫЖ 1948
Выданьне Беларускае Рэлігійнае Місіі

З дазволу духоўнае ўлады.

УСТУП

Аб паходжаньні чалавека з навуковага гледзішча так шмат напісана, што нават цяжка закранаць гэтую тэму ў рамах невялікага часапіснага артыкулу, каб у ім яксьлед здавальняюча паказаць сучасны стан гэтага так важнага пытаньня. Тым-ня-менш адчуваецца паважная патрэба інфармаваць чытачоў на гэтую тэму, бо ворагі рэлігіі, перакручваючы факты, выкарыстоўваюць гэтую тэму для свае прапаганды.

Біблійнае апавяданьне аб сатварэньні чалавека не зьяўляецца навуковым трактатам і напісана для простых людзей старое мінуўшчыны ў прыступнай для іх форме і мае галоўную мэту даказаць, што чалавек, як і ўвесь сусьвет існуе з волі Бога. Справаю навукі ёсьць прасьлядзіць, як Бог карыстаўся сваімі законамі ў сатварэньні чалавека, таму людзі і маюць уроджаную непераможную цікавасьць і гон да здабыцьця веды.

У сучасны мамэнт ёсьць паважныя адкрыцьці што да гэтага пытаньня, аднак было, а ў некаторых асяродках яшчэ і цяпер ёсьць, нямала шарлатанства нават між «навукоўцамі», якія ў пагоні за сэнсацыямі ашуквалі грамадзтва рознымі «знахадкамі чарапоў, то Евы, то Адама». У 1923 г. здарыўся нават такі выпадак: Газэты падавалі сэнсацыю, што нарэшце знайшлі чэрап доўгашуканага продка чалавека — самага запраўднага малпалюда. Яго меў знайсьці каляніст Вэнрыя ў Аргэнтыне каля Пазо. Д. Вольф азначыў яму век — 500.000 г.; ангельскі вучоны Сміт апісаў як гэты малпалюд жыў і здабываў карэньні й яйцы ма-

лых птушак сабе на пажыву, але па двох месяцах выявілася, што гэта нават і ня чэрап, але найзвычайнейшы камень. Падобныя выпадкі крыху адменнага характару здараліся і раней.

Пасьля гэтага вучоныя што раз больш асьцярожна і паважна адносяцца да новых знахадкаў, а гэта адбіваецца спрыятліва на поступе дасьледжванага пытаньня.

Для лепшае арыентацыі найперш падамо некаторыя

Агульныя заўвагі:

Кожная галіна навукі мае асобную тэрміналёгію, якая для неабазнанага чытача заўсёды стварае большую або меншую перашкоду для яснага зразуменьня абгаворванае тэмы. Справаю паходжаньня чалавека найбольш цікавяцца дзьве галіны навукі: палеанталёгія і антрополёгія. З іхняе багатае тэрміналёгіі, для зразуменьня нашае тэмы, неабходна ведаць хоць самае асноўнае. Замест біблейскіх «дзён» тварэньня сёньня карыстаюцца грэцкім словам эра, якая ў сваю чаргу дзеліцца на пэрыяды ў такім парадку:

Эры:	**пэрыяды:**
Археозойская	Архайскі (азойскі)
Палеозойская: (пяршачная)	Кэмбрыйскі Сілюрыйскі Дэвонскі Каменнавугальны Пэрмскі
Мэзозойская: (другачная)	Трыяс Юр Крэйдавы
Кэнозойская: (трацічная)	Эоцэн Оліґоцэн Міоцэн Пліоцэн
Нэозойская: (чацьвярцічная)	Плеістацэн Олёцэн (сучасны)

Варта зацеміць, што падобна як у біблейскім апавяданьні чалавек быў створаны ў апошні дзень тварэньня, так і ў сучаснай палеанталёгіі чалавек меў зьявіцца на парогу Кэнозойскае і Нэозойскае эры у канцы Пліоцэну.

Час трываньня паасобных пэрыядаў (падобна зрэштаю як і біблейскіх «дзён») рознымі вучонымі ацэньваюцца вельмі розна, так што тысяча, а нават і дзесяць тысяч гадоў у іхным гадалічэньні ня мае значэньня. Век знахадак азначаецца паводля тых пластоў зямлі, у якіх іх знаходзяць. Паўставаньне пластоў абумоўліваецца рознымі касмічнымі, гэалёгічнымі і мэтэрэолёгічнымі зьявішчамі; да гэтага створана аж некалькі дагадак, але сёньня найбольш пpыняты мэтад аблічаньня веку пластоў падаў Міланковіч, апіраючыся на факце сыстэматычнае зьменьліваcьці сонечнае радыяцыі (выпраміненьня), якія абумоўліваюць паўставаньні ледавіковых пэрыядаў.

Пасьля гэтых агульных заўвагаў пяройдзем да пералічэньня найстарэйшых знахадак людзкіх касьцякоў.

Чалавек старэйшага Плеістацэну.

Да рэштак найстарэйшага чалавека знойдзеных на абшары Эўропы, належаць:

1. Некалькі костак чэрапу і канцавін знойдзеных у 1911 і 1918 г.г. Дэвстонам каля Пільтдоўн у Англіі. Чэрап азначаецца малым уцякаючым чалом і выстаючымі надброўнымі дугамі. (Назвалі яго Эоантропос).

2. Частка чэрапу знойдзеная ў 1936 г. Сванскомбам у той-жа Англіі на берагох Тамізы адначасна з прыладамі Ашэльскае культуры. Гэты чэрап яшчэ больш некамплетны чым папярэдні, але з больш увыдатненымі азнакамі сучаснага чалавека, таму некаторыя аспрэчвалі яго старавет-

насьць, аднак умысная камісія Лёнданскага Антрапалягічнага Інстытуту ў 1939 г. прызнала яго прыналежнасьць да старшага Плеістацэну.

3. Сківаца знойдзеная ў 1907 г. каля Гайдэльбэргу ў Пячоры Маер — Нямеччына — яна вельмі масыўная з тыпічнымі людзкімі зубамі, але без падбародка, што яе зьбліжае да шымпанзе.

На абшары Азіі й іншых краінаў маецца крыху больш рэштак.

4. У раскопках каля Пэкіну пачынаючы ад 1929 г. да сёньня знойдзена ў аднэй пячоры (Чу-Ку-Тіен) каля сарака рэштак чэрапоў і вельмі мала іншых костак істоты, якую назвалі сінантропос. Чэрапы побач азнак сучаснага чалавека маюць некаторыя азнакі малпячыя, як: плоскае ўцякаючае чало, нізкае цемянное скляпеньне, моцна выстаючыя надброўныя дугі. Аднак самая пячора, дзе іх знайшлі вельмі загадкавая, бо ёсьць толькі сьляды вогнішча і шмат косьцяў іншых жывёлаў, якія зьмешаныя з чарапамі сінантрапа. Выглядае так што ўсе яны зьяўляюцца рэшткамі банкету чалавека людаеда, які мусіў быць іншы ад таго сінантропа. Век сінантропа адносіцца да канца Пліоцэну.

5. Найбольш выразна выступаюць прымітыўныя азнакі ў чэрапе знойдзеным Др. Дюбуа на абтоку Ява ў 1890 г. у гадох 1936, 1937 і 1939 знойдзена яшчэ некалькі частак гэткага чэрапу — гэта той слаўны пітэкантропос (малпалюд), аб якім свайго часу так шмат пісалі й гаварылі. У ім запраўды сьледныя амаль у аднолькавай ступені малпячыя й людзкія азнакі, таму некаторыя абавязкава ў ім хацелі дабачыць продка сучаснага чалавека. Аднак мейсца знахадкі вельмі дзіўнае, бо побач знойдзена косткі бядрыц, якія больш падобныя да сучаснага чалавека, чым да таго пітэкантрапа, а сам пласт зямлі дзе зроблены гэтыя знахадкі некаторыя адносяць да сярэдняга Плеіс-

тацэну, а гэта сьведчыла-б, што ён зьяўляецца толькі доказам пераэкзістэнцыі (пераіснаваньня) прымітыўнага людзкога тыпу побач больш разьвітых расаў.

6. На абшары Афрыкі ў 1935 г. каля возера Ньярса знойдзена два вельмі прымітыўныя чарапы істоты, якую назвалі афрыканатропос. Марфалягічныя азнакі гэтых чарапоў даволі блізкія да гэных Пэкінскіх сінантрапаў, аднак супаставіць іх век вельмі цяжка. Што да самага спародненьня, як і што да веку погляды вучоных вельмі разьбежныя, бо прымітыўныя азнакі ў афрыканантрапа выступаюць вельмі выразна, але сам пласт дзе яго знайшлі паводля думкі некаторых вучоных (Іль Рээв) мае адносіцца нават да сярэдняга Плеістацэну, значыць на час нэандэртальскага чалавека. Але іншыя апіраючыся толькі на марфалягічных азнаках (Г. Вайнэрт) стараюцца дабачыць у ім найстарэйшага чалавека.

7. Зусім нядаўна шмат гоману між вучонымі нарабіла вестка аб знахадцы ўва Усходняй Афрыцы чарапоў і шкелетаў людзей із старэйшага Плеістацэну зусім падобных да сучаснага чалавека расы нэграў (Ольдовэй, Канам), аднак пазьнейшыя досьледы аднесьлі гэтую знахатку да сярэдняга Плеістацэну.

8. У 1947 г. каля Каіру знайшлі стаянку чалавека з канца Плюцэну, але дакладнейшых вестак аб іншых знахадках на гэтым мейсцы пакуль што няма — досьледы прадаўжаюцца. Падобную знахадку у тым-жа 1947 г. зрабілі на абшары З.Ш.А.

9. Да тэмы будзе успомніць, што ў Аўстралійскай Афрыцы знойдзена чэрап дзіцяці гадоў 7 з вельмі прымітыўнымі азнакамі зближанымі да шымпанзе, назвалі яго Аўстралёпітэкус афрыканус. Аднак паважнейшыя вучоныя агулам устрымліваюцца гаварыць аб ім нешта больш канкрэтнае,

зважыўшы на тое, што маюцца дачыненьні толькі з часткаю чэрапа малога дзіцяці. Пазьней знойдзена ў тэй-жа Афрыцы яшчэ два ашчапкі чарапоў неазначанага веку, што да якіх нічога канкрэтнага сказаць тымчасам немагчыма.

Чалавек сярэдняга Плеістацэну.

Калі мы бачылі, што чалавек ужо існаваў у пачатку Плеістацэну, а нават у канцы Пліоцэну, дык няма патрэбы гаварыць аб тым, што чалавек існаваў у сярэднім Плеістацэне, аднак таму што нават самы агульны пагляд на людзей сярэдняга Плеістацэну кідае вельмі важны сьвет на некаторыя спрэчныя пытаньні, нельга не закрануць гэтага пэрыяду.

Найбольш ведамым і распаўсюджаным у Эўропе і часткава ў Афрыцы чалавекам пары сярэдняга Плеістацэну быў так званы нэандэртальскі чалавек. Першы яго чэрап знойдзена ў 1856 г. каля Діссэльдорфу ў Нямеччыне. Да сёньняшняга дня ведама больш 80 касьцякоў гэтага чалавека. Росту ён быў невялікага, да 1,60 м. Галаву меў падаўгастую з нізкім уцякаючым чалом, але з досыць вялікім мозгам каля 1.400 куб. цм. (Сучасны чалавек мае нармальна ад 1.375 да 1.500 куб. цм.). Надвочныя дугі былі даволі выстаючымі і сківіца была без падбародка. Аб тым што гэта быў чалавек няма найменшага сумніву, бо ён умеў вырабляць прылады з косьці і каменьня, а нават меў рэлігію — хаваў сваіх пакойнікаў.

Крыху адменная раса нэандэртальскага чалавека жыла на абтоку Ява і ў Афрыцы (Радэзыя).

У 1931 г. на гары Кармэль у Палестыне знайшлі цікавы чэрап, які мае мешаніну азнак сучаснага чалавека і нэандэртальца амаль у аднолькавай ступені. Некаторыя вучоныя дабач-

ваюцца ў ім плоднае скрыжаваньне дзьвёх людзкіх расаў, іншыя наадварот стараюцца ў ім знайсьці пераходны тып, аднак час сярэдняга Плеістацэну ня зусім у згодзе з гэтаю апошняю дагадкаю.

У 1933 г. на абшары Нямеччыны каля Штайнгайму знойдзена чэрап, які побач магутных надброўных дугаў нэандэртальца мае выразныя азнакі сучаснага чалавека

На абшары Італіі ў 1863 г. капаючы чыгуначны шлях каля Ульму знойдзена чэрап чалавека сучаснае расы разам з крамянямі мустэрскае культуры, якую знайходзім і ў нэандэртальцаў. У акрузе Вэроны каля Кінцана на абшары тае-ж Італіі нядаўна знайшлі яшчэ адзін чэрап чалавека з сярэдняга Плеістацэну, які вельмі падобны да чэрапу з Сванскомбу (эоантропос).

Адгэтуль відаць, што ў сярэднім Плеістацэне існавалі дзьве розныя людзкія расы: нэандэртальская і зблiжаная да сучаснага чалавека.

Чалавек малодшага Плеістацэну.

Пераход з сярэдняга да малодшага Плеістацэну зазначыўся вельмі характэрным фактам: нэандэртальскі чалавек гіне бясcьледна так на абшары Эўропы, як і на іншых кантынэнтах, а яго мейсца займаюць людзі сучаснага тыпу (homo sapiens) з невялікімі расавымі розьніцамі, як: (Кро-Маньён, Комб, Прэдмосьць, Грімальдi).

Пераходных расаў пакульшто ня знойдзена; чарапы з Кармэль і часткава з Штайнгайму, хоць ад бяды маглі-б уважацца за гэткія пераходныя зьвёны, але яны адносяцца да таго самага сярэдняга Плеістацэну, калі Эўропу засяляў нэандэрталец.

Выснаўкі.

Сабраўшы ўсе вышэйпаданыя факты і супаставіўшы іх разам, ясна пабачым, што яны вельмі нездавальняючыя, каб з іх утварыць канчаткова пэўны і нязьбіты абраз аб паходжаньні чалавека. Не зважаючы на нутранае падабенства будовы арганізму чалавека і чалавекападобных малпаў і на пэўнае вонкавае падабенства, між імі ёсьць шматлікія й істотныя розьніцы. Яшчэ Ліннэй (1707-1778) ня прызнаючы ніякае эвалюцыі, залічыў і чалавека і малпаў на аснове гэтага падабенства да аднае сям'і прыматаў. Аднак побач падабенства тыя розьніцы, што дзеляць чалавека ад малпаў такія вялікія, што зьяўляюцца амаль прадоньнем. Мазгі найбольш разьвітых малпаў не перавышаюць 600 гр., а мазгі найменш разьвітага чалавека маюць 1.250; усе малпы ходзяць на чацьвярні—чалавек на дзьвёх нагах і мае заўсёды ўзьнятую ў гару галаву; малпы ўсе касматыя — чалавек мае голую скуру, якую закрывае вопраткаю. Да таго малпам зусім няведама разумнае і псыхічнае жыцьцё. — Толькі чалавек мае сьведамасьць сябе, ведае маральнасьць і мае пачуцьцё сарамязьлівасьці, можа думаць і мае творчую ініцыятыву, якая стварае цывілізацію, а гэта ўжо духовыя сілы, якія падпарадкавалі сабе матэрыю і як такія з матэрыі паўстаць не маглі, бо яшчэ такога на сьвеце ніколі ня было, каб насьледак быў большы за прычыну, а таму што людзкая інтэлігэнцыя перавышае матэрыю, дык і паўстаньня яе трэба шукаць недзе па-за матэрыяю.

Аднак шмат якія ранейшыя вучоныя, не зважаючы на навуковую праўду ўмысна так падбіралі і супастаўлялі розныя факты, каб паказаць, што між чалавекам і чалавекападобнымі малпамі мусіць быць неразрыўны зьвязок, а калі ў іх даказваньні бракавала пераходных зьвеньняў, дык

іх нават падраблялі (Гэккэль ў 1913 г.), а іншыя больш чэсныя выказвалі надзею на тое, што гэткія зьвеньні яшчэ знойдуцца.

Мінула ня мала часу ў пошуках гэтых зьвеньняў і вось сёньня мы бачым зусім адменны абраз. Тыя факты, тыя знахадкі, якія раней служылі зьвеньнямі ў разьвіцьці чалавека стварылі зусім асобны рад, каб канчаткова згінуць бясcьледна. Гэткі рад твораць: чарапы пітэкантрапа, сінантрапа, гайдэльбэргца (з Майер), нэандэртальца і родэзыйскіх яго субратоў — і на гэтым іх радавод раптам канчаецца. Але ці яны запраўды маюць лучнасьць між сабою — на гэта няма доказаў.

З другога боку ім можна супаставіць іншы рад чарапоў: эоантропос з Пільтдоўн, з Сваскомбу, Ульму, Кінцано і малодшага Плеістацэну, якія ўсе належаць да сям'і сучаснага чалавека.(homo sapiens).

Аб тым, які мог быць зьвязок між гэтымі двама радамі ў сучасным стане знахадкаў нельга сказаць. Калі чалавецтва пітэнкантрапаса вельмі праблематычнае, дык нэандэрталец быў такім бясспрэчна. Але вельмі вымоўны той факт, які сёньня бальшынею вучоных прымаецца што раз больш гэта думка, што нэандэртальскі чалавек выгінуў дзякуючы сваёй дэгэнэрацыі пры спатканьні з людзьмі іншае здаравейшае расы. Вось-жа мы мелі-б дачыненьні не з прагрэсыўнаю, але рэгрэсыўнаю эвалюцыяю, бо запраўды перад нэандэртальцам існавалі; людзі больш разьвітыя (эоантропос). Аб тым, што ў прыродзе гэткія факты здараюцца ёсьць ня мала доказаў; гэткім парадкам выгінулі галаваногія амманіты разьвіўшыся да фантастычных формаў, гэткім-жа парадкам сыцылійскі пяцімэтровы слон вырадзіўся да вялічыні сабакі і канчаткова выгінуў зусім. Відаць па гэткай лініі пайшоў і нэандэрталец.

Аднак гэта ўсё яшчэ ня высьняе загадкі паў-

станьня першага чалавека. Відаць што ў прыродзе мусіў адбыцца нейкі раптоўны скок, які не пакінуў ніякіх пераходных формаў. Чалавек зьяўляецца на зямлі раптам. Сёньня ўважаюць за дзіцячую байку цьверджаньне Энгельса, што праца і рука стварыла чалавека чалавекам — неадна парода малпаў мае рукі ня менш разьвітыя чым у чалавека і можа так-жа спрытна працаваць пад муштру чалавека, але ўсёроўна астаецца малпаю. Так-сама праца мурашак ўвайшла ў прыказку, аднак іх не давяла да вышэйшага развою. Таму пасьля доўгіх і скрупулятных досьледаў штораз часьцей адзываюцца галасы розных вучоных, паводля якіх чалавек стаўся чалавекам дзякуючы сваёй разумнай душы, якая аднак не магла паўстаць з ніякае эвалюцыі матэрыі і цела. На гэтай аснове пытаньне аб паходжаньні чалавека распадаецца на два: паходжаньне цела і паходжаньне душы.

З гледзішча сьв. Пісаньня і сьв. Царквы няма ніякае засьцярогі разглядаць асобна гэтыя пытаньні, бо няма ніякае супярэчнасьці ў тым, каб Бог карыстаючыся прыроднымі прычынамі падрыхтоўваў ў павольным развою людзкое цела да тае ступені, калі яно стала адпаведным для ўспрыняцьця душы і тады адбыўся той творчы акт, калі Бог «удыхнуў у аблічча чалавека душу жыцьця» (Быц. 2, 7).

Магчыма, што прысутнасьць душы выклікала ў целе першага чалавека так асноўныя і раптоўныя зьмены, што не асталося пераходных формаў. Які мог быць той арганізм, што яго Бог абраў для чалавека, покуль што ня выясьнена.

Аб тым, што ў прыродзе акрамя павольных зьменаў ёсьць раптоўныя зьмены, так званыя мутацыі ўжо даўно зацеміў ведамы батанік Дэ Вріс (1901). Мутацыі адбываюцца з нявысьледжаных

яшчэ нутраных прычынаў — дык чаму гэта не магло стацца з чалавекам?

Усё гэта аднак яшчэ на толькі мала прасьледжана, што выказваецца ўсяго як больш або менш абаснаваныя дагадкі. На аснове таго сабранага да сёньня матэрыялу, нават такія вучоныя, як праф. Бранк—дырэктар гэалёгічна-палеонтолёгічнага Інстытуту ў Бэрліне заявіў: «Палеонтолёгія ня знае дагэтуль ніякага іншага продка сучаснага чалавека, як чалавека».

Аднак ўроджаны чалавеку гон да веды ніколі ня дасьць супачыць прыродаведам і дасьледнікам у пошуках продкаў чалавека, але на падставе вяковых досьледаў так вернікі, як і ўся Хрыстова Царква зусім спакойна сьлядзіць за гэтымі пошукамі, бо на аснове гэтых досьледаў вучоныя заяўляюць: «Цяпер антрапалёгія шукае пачатку людзкога цела, яна яшчэ толькі шукае; няма патрэбы баяцца, што яна дойдзе да асуджальных, ці гэрэтычных высноўкаў, бо чудовую кнігу прыроды напісаў ня хто іншы,як Сам Бог, і яна ня можа быць звадлівай; пэўна-ж трэба ўмець яе чытаць, таму прыродаведы, якія ўсё жыцьцё прысьвячаюць расшыфроўцы гэтае цяжкае кнігі—уканцы—ёсьць шукальнікамі праўды... Бальшыня аўтараў сьцьвярджае, што сёньня яшчэ перадчасна будаваць гэнэалягічныя дрэвы чалавека, бо сёньня яшчэ ня час выцягваць сеткі, але іх трэба закідаць, каб вылоўліваць шматлікія факты...» заявіў у 1925 г. Міланскі праф. Пасторі, і быццам прадоўжваючы гэтую думку Сьвяцейшы Айцец Пій XII у 1941 г. на інаўгурацыі Акадэміі Навук казаў: «Вос-жа не астаецца нічога іншага, як аставіць для будучыні даць адказ, на гэтае пытаньне, каб аднаго дня навука асьвечаная і ведзеная правідам дала пэўныя і бясспрэчныя вынікі што да так важнае справы».

Так выглядаюць сёньня тыя факты, на якіх свайго часу матэрыялістычная прапаганда старалася аперці сваю бязбожніцкую працу. У кожнай галіне веды што раз больш выяўляюцца сьляды Бога ў прыродзе, дык будзем спакойна сьлядзіць за тым, што і ў пошуках нашага першага продка ўканцы выявіцца мудрая рука сусьветнага Будаўніка і нашага Айца- Бога.
